# Роля апазіцыі і (або) грамадзянскай супольнасці ў дзяржаўнай палітыцы і працэсе прыняцця палітычных рашэнняў

## Эсэ выпускніка курсу “Публічная палітыка для пачаткоўцаў”

Апазіцыя заўсёды была адным з самых важлівых атрыбутаў у палітычным жыцці кожнай краіны. Дзякуючы апазіцыі грамадзяне маюць мажлівасць выказаць альтэрнатыўны пункт гледжання. Напэўна, часцей за ўсе такія ідэі выказвала грамадзянская супольнасць. Частакай працы грамадзянскай супольнасці з’яўляюцца і мітынгі. Кожны беларус ведае аб знакамітых мірных мітынгах 2020 года. Мажліва гэта былі адны з самых маштабных мітынгаў сучаснай беларускай гісторыі. Беларусы зразумелі, што яны не адны, і ўвесь астатні цывілізаваны мір таксама. І што ўлада - не легітымна. Апазіцыя грае вялікую ролю не толькі ў справах унутранай палітыкі, але і ў справах знешняй. Напрыклад, каб ствараць нармальную, здаровую эканоміку, трэба прытрымлівацца прынцыпу шматвектарнай палітыкі, але яе нельга блытаць са “шматвектарнай (з уклонам на ўсход) палітыкай” Лукашенкі. Трэба ўсюды прытрымлівацца прынцыпу шматвектарнай палітыкі, бо, напрыклад, пры крызісе ўсходняга рынку заўседы ёсць заходні. Але змяніць палітыку знешнюю немагчыма, калі гэта вырашыць не народ, а тыя, хто рабуе свой жа народ.

Аднак што будзе, калі апазіцыя знішчана? У такой сітуацыі з’яўляецца шмат іншых праблемаў. Пры такіх умовах палітычная ўлада становіцца вельмі ўразлівая да аўтарытарных працэсаў у краіне. Як следства краіна паступова становіцца зачыненай ад міра і на такой глебе могуць пачаць развівацца рэпрэсіі да ўсяго апазіцыйна настроенага грамадства. А пасля ўсталёўваюцца аўтакратычныя, таталітарныя, дыктатарскія рэжымы.

Апазіцыя ў Беларусі/Літве заўседы была вельмі моцнай і грала вялікую ролю ў грамадскім жыцці. У гадзіны Першай Сусветнай вайны нацыяналісты сваёй краіны вырашылі стварыць Беларускую Народную Рэспубліку, але ўтрымацца на пазіцыі незалежнай краіны ў іх не атрымалася. Таму што большая колькасць грамадства не ведала, хто яны такія і навошта ім штосці абараняць. Але, калі атрымаўся першы Ўсебеларускі з’езд і нашыя палітыкі прынялі Першую Устаўную Грамату, усё крыху змянілася. Гэта дапагло зразумець бальшавікам, што вырашыць нацынальнае пытанне будзе не вельмі проста і хутка. Таму ў будычым ім прыйшлося ўтвараць Беларускую ССР. Беларусь амаль засталася краінаю, хаця і без сваёй ўлады.

У 2020 грамадзянская супольнаць зноў паспрабавала ўзяць справы сваёй краіны ў свае рукі, але гэта не атрымалася. Як я гаварыў раней, усе беларусы ведаюць пра мірныя мітынгі на плошчах сваіх гарадоў. Але нашая супольнасць не вырашылась на сілавы метад рашэння пытанняў. Хтосці гаварыў, што гэта не па еўрапейску, гэта атрыбут варвараў, у гэтым няма сэнсу і г.д. Ніхто не ведае, як бы ўсе атрымалася, можа і Расея бы ўвайшла з войскамі ў Беларусь раней. Да чаго я гэта ўсё

распавядаю? Да таго, што адной грамадскай супольнасці недастаткова. Калі грамадства жадае штосці змяніць, нават невялікую, не першы погляд, рэч, ім трэба мець больш чым проста шмат незадаволеных людзей. Палітыкі, лідары нацыі, асведчанасць і сама арганізаваная апазіцыя. Бяз гэтых мінімальных рэчаў працэс прыняцця палітычных рашэнняў будзе немагчымы. Таксама людзі павінны адчуваць сябе незалежнымі і свабоднымі грамадзянамі свету, а галоўнае - сваёй краіны. Таму што той народ, які жыве ў любой форме аўтакрыі/аўтарытарызму ці там, дзе іх свабоды вырашаюцца маленькай колькасцю людзей, не мае ніякай свабоды ў сваім розуме.

На маю думку, каб выйсці з залежнасці ад іншых краін і іншых улад, якія не адказваюць усім патрэбам народу нашай краіны, нам патрэбна пачаць разумець, што для нас каштуе наш герб, сцяг, мова і продкі. Таксама змяніць пункт гледжання ўсіх тых грамадзян, якія да гэтага часу лічаць, што хтосці ішны зробіць усё для беларусаў, што хтосці верне нам нашу краіну за звычайнае “дзякуй”. Гэта толькі мары, тыя ж самыя мары, што Лукашенка сам аддасць уладу. Нашаму грамадству не хапае тых пылу і ярасці, якія былі ў французаў 200 год таму. Нашаму грамадству трэба разумець, што калі не яны самі пачнуць кантраляваць дзеянні сваёй краіны, то гэта будзе рабіць нехта іншы. І ён, хутчэй за ўсё, будзе рабіць гэта ў сваіх мэтах.

Такім чынам, апазіцыя грае вялікую ролю ў краіне. Апазіцыя разам з грамадскай супольнасцю маюць магчымасць кардынальна змяніць усю краіну. Яны неацэнна важныя часткі нацыі, без якіх астатняя не можа існаваць. Зараз, праз 2 гады з 2020, кожны дзень усё больш і больш беларусаў цікавяцца сваім станам у свеце, палітыкай і сваёй нацыяй. Зараз нашая супольнасць адзіна, як ужо не было шмат год і гатова да сур’ёзных крокаў у сваім жыцці. Але кожны з нас марыць, што ён зможа вярнуцца на сваю бацькаўшчыну, зможа абняць сваіх родных і зможа гэта зрабіць бяз усякага страху і ваганняў.

Аутар: Цімафей